# Сёлета птушкай года выбраны экстравагантны ўдод.



Пра гэта рэдакцыі паведаміў дырэктар грамадскай арганізацыі "Ахова птушак Бацькаўшчыны" Віктар ФІНЧУК.

Удод з'яўляецца сярэдняга памеру птушкай, якая мае яркае і незвычайнае для мясцовых крылатых чорна-аранжавае апярэнне. У яго доўгая і вузкая дзюба і прыгожы веерападобны чубок. Распазнаць ўдода можна лёгка і па яго голасе, бо крыкі гэтай птушкі часам нагадваюць слова "ўдод".

У нашай краіне гэты від лічыцца звычайным, аднак ён больш распаўсюджаны ў паўднёвых раёнах Беларусі. Птушкай 2013 года ўдода выбралі не толькі дзякуючы яго яркай "вопратцы" і пазнавальнасці, але і ў сувязі з сур'ёзнымі праблемамі, якія ўзнікаюць у гэтай птушкі на тэрыторыі Беларусі.

Напрыклад, нават сёння спецыялісты не ведаюць дакладны арэал распаўсюджвання ўдода і яго колькасць. Аднак галоўнай з'яўляецца "жыллёвая" праблема ўдодаў, якія селяцца ў дуплах. Звычайна дуплы ўтвараюцца ў старых і сухіх дрэвах, якія ў нас актыўна высякаюцца. Таму ўдоды часта сутыкаюцца з дэфіцытам месцаў для гнездавання, а ў выніку спрабуюць уладкаваць свае "кватэры" ў пабудовах побач з чалавекам, што не заўсёды бяспечна.

У сувязі з гэтым падраздзяленні АПБ сёлета плануюць правесці біятэхнічныя мерапрыемствы па вырабе і засяленні штучных гняздоўяў для ўдодаў. Плануецца правесці поўнамаштабны ўлік гэтага віду птушак па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Будуць праведзены і традыцыйныя конкурсы малюнкаў і казак пра гэтую экзатычную птушку.

***Сяргей ПАЛІНІН.***

**Источник:** Звязда. — 2013 — № 3.(9 студз.) — С. 8.